*УДК 327*

# АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ ГІСТАРЫЧНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУК У ФАРМІРАВАННІ НАВУКІ АБ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІНАХ: ЗАМЕЖНЫ І БЕЛАРУСКІ ВОПЫТ

**У. Е. Снапкоўскі**

*доктар гістарычнык навук, прафесар, прафесар кафедры міжнародных адносінаў факультэта міжнародных адносін БДУ, г. Минск, Беларусь, snap@bsu.by*

Артыкул прысвечаны разгляду штматбаковага ўзаемадзеяння гістарычнай, палітычнай і іншых навук у працэсе фарміравання навукі аб міжнародных адносінах наогул ў свеце і Беларусі ў прыватнасці.

***Ключавыя словы:*** міжнародныя адносіны; гістарычная навука; палітычная навука; юрыдычная навука.

# ON THE INTERACTION OF HISTORICAL AND POLITICAL SCIENCES IN THE FORMATION OF THE SCIENCE OF INTERNATIONAL RELATIONS: FOREIGN AND BELARUSIAN EXPERIENCE

**U. E. Snapkouski**

*Doctor of Historical Sciences, Professor, Professor of the Department of International Relations Faculty of International Relations, Belarusian State University, Minsk, Belarus, snap@bsu.by*

The article is devoted to the consideration of the three-sided interaction of historical, political and other sciences in the process of forming the science of international relations in general in the world and Belarus in particular.

***Keywords:*** international relations; historical science; Political science; legal science.

У адпаведнасці з класіфікацыяй УДК (складзена ў СССР і перавыдадзена ў Расійскай Федэрацыі, выкарыстоўваецца таксама ў Беларусі) і пералікам навуковых спецыяльнасцей ВАК Рэспублікі Беларусь, навукі аб міжнародных адносінах не існуе. Няма такой навукі і ў Расійскай Федэрацыі і іншых постсавецкіх дзяржавах. Пра Захад скажу пазней. А што ёсць? Ёсць тэрмін “міжнародныя адносіны”, які шырока выкарыстоўваецца ў навуцы, адукацыі, публічнай сферы і палітыцы. Ім звычайна абазначаюць сферу сацыяльных адносін (міждзяржаўныя адносіны) і аб’ект, прадмет пазнання (навуковы кірунак і вучэбную дысцыпліну). З

пункту гледжання аб’екта і прадмета пазнання (даследавання) “міжнародныя адносіны” з’яўляюцца вялікім навуковым кірункам (навуковай спецыяльнасцю) і буйной вучэбнай мегадысцыплінай ці комплекснай дысцыплінай. У такім навукова-адукацыйным кантэксце “міжнародныя адносіны” ўваходзяць састаўной часткай у гістарычную, палітычную і шэраг іншых сацыяльна-гуманітарных навук (юрыдычную, сацыялагічную, эканамічную, культуралагічную).

Першыя кафедры міжнародных адносін узніклі на Захадзе пасля Першай сусветнай вайны (Вялікабрытанія, Францыя, Германія, ЗША). Яны вывучалі пераважна праблемы гісторыі міжнародных адносін, дыпламатыі, міжнародных канфліктаў, міжнароднага права. Пасля Другой сусветнай вайны ў заходніх дзяржавах узмацніўся інтарэс да паліталогіі, якую сталі вывучаць і выкладаць у цеснай сувязі з міжнароднымі адносінамі і сусветнай палітыкай. Так на Захадзе ўзнікла адзіная навука пад назвай “Палітычная навука і міжнародныя адносіны” (Political Science and International Relations). З’явіліся і свае класікі (Р.Арон, Г.Маргентаў, П.Кохэн, М.Мерль і інш.).

У СССР навука аб міжнародных адносінах фарміравалася ў выніку ўзаемадзеяння гістарычнай і юрыдычнай навук. У пасляваенны час у Маскве ўзніклі буйныя цэнтры міжнародных адносін (МДІМА-МГИМО, Дыпламатычная акадэмія, шэраг даследчых інстытутаў АН СССР). Разам з агульнасаюзнымі (расійскімі) установамі амаль адначасова ці пазней з‘явіліся аналагічныя цэнтры ва Украінскай ССР (Інстытут міжнародных адносін Кіеўскага ўніверсітэта, Інстытут сацыяльных і эканамічных праблем замежных краін АН УССР). У БССР не атрымалася стварыць цэнтр даследавання ці вывучэння міжнародных адносін, хаця такія спробы былі і аўтар пра гэта пісаў. Гэтую тэматыку вывучалі ў БДУ (гістарычны факультэт, агульнаўніверсітэцкія кафедры навуковага камунізму і гісторыі КПСС) і ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Пасля атрымання незалежнасці ў БДУ амаль адначасова ўзніклі кафедры міжнародных адносін і паліталогіі (1992 г.). Кафедра міжнародных адносін пачала рыхтаваць спецыялістаў па гістарычнай спецыяльнасці 07.00.15 - Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Кафедра паліталогіі на сённяшні дзень рыхтуе спецыялістаў па шэрагу спецыяльнасцей палітычнай навукі, у тым ліку па спецыяльнасцях, звязаных з міжнароднымі адносінамі: 23.00.04 – Палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця, 23.00.05 – Политическая регионалистика. Этнополитика (палітычныя і сацыялагічныя навукі) (гл. Номенклатура специальностей научных работников Республики Беларусь. Приложение к постановлению Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 8 июня 2009 г. № 4 «Об утвер-

ждении Номенклатуры специальностей научных работников Республики Беларусь и признании утратившими силу некоторых правовых актов» с изменениями и дополнениями согласно постановлениям Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 3, от 5 июня 2013 г. № 1 [1]. Спецсавет па палітычных навуках дзейнічае з 1992 г.

Кафедра міжнародных адносін з пачатку XXI ст. дадала да сваёй гістарычнай спецыяльнасці 07.00.15 дзве спецыяльнасці палітычнай навукі: 23.00.04 і ў апошні навучальны год- 23.00.06 – Канфліктaлогія. Падзел спецыяльнасцей паміж гістарычнай і палітычнай навукамі ў галіне даследавання міжнародных адносін адлюстраваўся ў стварэнні двух спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысетацый: спецсавета па спецыяльнасці гістарычнай навукі 07.00.15 і спецсавета па шэрагу спецыяльнасцей палітычычнай навукі, у тым ліку звязаных з міжнароднымі адносінамі – 23.00.04, 23.00.05 і 23.00.06. Спецсавет па спецыяльнасці 07.00.15 дзейнічаў у 1998-2012 гг., пасля чаго гэта спецыяльнасць увайшла у лік іншых гістарычных спецыяльнасцей, прадстаўленых у спецсавеце БДУ па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гістарычных навуках.

Падводзячы вынік, адзначым, што сёння ў Беларусі “міжнародныя адносіны” як вялікі навуковы кірунак (навуковая спецыяльнасць) і буйная вучэбная мегадысцыпліна інстытуцыянальна і змястоўна-тэматычна падзелены паміж факультэтам міжнародных адносін (кафедра міжнародных адносін і іншыя), юрыдычным факультэтам (кафедра паліталогіі), гістарычным факультэтам (кафедры ўсеагульнай і беларускай гісторыі). Гэта падзел выходзіць за межы БДУ, паколькі міжнародныя адносіны з рознай ступенню глыбіны і шырыні вывучаюць і даследуюць у іншых універсітэтах (Гомель, Віцебск, Гродна), Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і іншых акадэмічных інстытутах (Філасофіі, Эканомікі).

У сістэме беларускай вузаўскай і акадэмічнай навукі назіраецца тэндэнцыя “растаскивания” (разцягвання) вельмі разнастайнай і прывабнай для аматараў і спецыялістаў тэматыкі міжнародных адносін па “нацыянальных” (кафедральных, факультэцкіх, інстытуцкіх) кватэрах. Даследаванні па гэтай мегадысцыпліне і мегакірунку вядуцца перш за ўсё па гістарычнай, палітычнай і шэрагу іншых сацыяльна-гуманітарных навук (юрыдычнай – міжнароднае права, сацыялагічнай –сацыялогія міжнародных адносін, эканамічнай – сусветная эканоміка, культуралагічнай – тэорыя і гісторыя культуры).

Каардынацыі навуковых даследаванняў па міжнародных адносінах не вядзецца, а факультэт міжнародных адносін БДУ, які па назве, струк-

туры і падбору высокакваліфікаваных кадраў мог бы прэтэндаваць на гэтую ролю, не выконвае місіі каардынацыі і планавання такіх даследаванняў. Адзначу, як адзін са стваральнікаў кафедры і факультэта міжнародных адносін, што такой задачы і такіх паўнамоцтваў перад ФМА ніхто пакуль не ставіў. Сёння гэта не ўваходзіць у навуковыя задачы факультэта, як і іншых падраздзяленняў БДУ і, як разумею, інстытутаў НАНБ. Падаецца, што з улікам сучасных тэндэнцый развіцця гуманітарных (гістарычнай) і сацыяльна-палітычных навук невызначаны ці недакладна акрэслены статус кірунка і дысцыпліны пад назвай “міжнародныя адносіны” захаваецца.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Приложение к постановлению Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 8 июня 2009 г. № 4 «Об утверждении Номенклатуры специальностей научных работников Республики Беларусь и признании утратившими силу некоторых правовых актов» с изменениями и дополнениями согласно постановлениям Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 3, от 5 июня 2013 г. № 1. [Электронный ресурс] URL: https://clck.ru/39Pj6Q. (дата обращения: 19.02.2024).